

**ЛАЎРЭЕНКА ЛАРЫСА ВІКТАРАЎНА** (БРЭСТ, БЕЛАРУСЬ),
настаўнік гісторыі ДУА "Сярэдняя школа в. Скокі",
магістр педагагічных навук

**УДК** 94 (476) «1921/1939»

# ГАНДАЛЬ У ЗАХОДНЕБЕЛАРУСКАЙ ВЁСЦЫ Ў 1921–1939 ГГ.

**Анатацыя**

У артыкуле даецца характарыстыка гандлю ў заходнебеларускай вёсцы. Вызначаюцца асноўныя віды гандлю, якія атрымалі распаўсюджанне менавіта на вёсцы. Раскрываецца роля гандлю ў паўсядзённым жыцці селяніна. Паказваюцца адносіны паміж вяскоўцамі і гандлярамі. Робіцца вынік, што заходнебеларускі рынак меў шэраг спецыфічных рысаў і характарызаваўся невялікай запатрабаванасцю ў спажывецкіх таварах у сувязі з нізкім дабрабытам насельніцтва і захаваннем значнага сектара натуральнай гаспадаркі ў вёсцы.

***Ключавыя словы***: гандаль, вулічны гандаль, разносна-развозны гандаль, нелегальны гандаль, канкурэнцыя, гандляры, менавы гандаль.

*«Все, чем для прихоти обильной*
*Торгует Лондон щепетильный*
*И по Балтическим волнам*
*за лес и сало возит нам»*
*А.С. Пушкин «Евгений Онегин»*

Гандаль заўсёды займаў значнае месца ў жыцці людзей розных этнасаў. І ў XIX стагоддзі, у час пушкінскага жыцця і творчасці, ён быў у Расіі не толькі разнастайны, але і міжнародны. Аб гэтым сведчаць словы з рамана А.Пушкіна "Евгений Онегин": *Все, чем для прихоти обильной / Торгует Лондон щепетильный / И по Балтическим волнам / За лес и сало возит нам*.

А якім ён быў у Заходняй Беларусі крыху пазней, ужо у пачатку XX стагоддзя? Паспрабуем сваім артыкулам адказаць на гэтае пытанне.

У 20–30-я гады XX стагоддзя гандаль займаў важнае месца ў сацыяльна-эканамічным жыцці Заходняй Беларусі і быў прадстаўлены стацыянарным,

перыядычным і неперыядычным гандлем. Вясковы гандаль быў бедны, дрэнна арганізаваны і складаўся з вялікай колькасці аднаасобных устаноў.

Гандаль у заходнебеларускай вёсцы насіў пасіўны характар. Тавары пастаўляліся ў той колькасці, якая магла быць рэалізавана, бо пакупная здольнасць сельскага насельніцтва была вельмі нізкай. Апроч падаткаў, сяляне плацілі масу розных збораў і павіннасцяў.

Саміх гандлёвых выплат на той час існавала каля 60 відаў. Найболей распаўсюджанымі былі выплаты ў выглядзе завышаных цэн на тавары першай неабходнасці, такія як: газа, соль, цукар, запалкі і г.д.

Асноўнымі харчовымі таварамі, напрыклад, жыхароў в. Чудзін Лунінецкага павета з'яўляліся хлеб, бульба, агуркі і капуста. Мяса, малако, а таксама цукар ужываліся ў невялікіх колькасцях. Яйкі вельмі часта мяняліся ў крамах на соль, фарбу, запалкі і іншыя дробязі [1, с. 198].

Паўсюднай з'явай, якая была характэрна як для гарадскога, так і для сельскага гандлю, як адзначалася раней, быў гандаль «на вока». Цэны былі вельмі нізкія. Увесну 1932 г. 1 кг. ялавічнага мяса яўрэй-пасрэднік прадаваў па 50 грошаў. Цана за цэлую карову ў такім разе вагалася ў памеры 15–30 злотых. Гадоўля буйной рагатай скаціны з'яўлялася амаль адзіным заняткам і крыніцай забеспячэння наяўнымі грашыма большасці сельскіх жыхароў Заходняй Беларусі [1, с. 189].

У вёсках, аддаленых ад гарадоў на вялікія адлегласці, прадметы першай неабходнасці сяляне выраблялі самі, а менавіта: хатнія прылады, посуд, адзежу, бялізну, санкі, вазы, сельскагаспадарчы і рамесны інвентар, кошыкі, сеткі, харчовыя тавары. Амаль усё сельскае насельніцтва на выраб адзежы і бялізны выкарыстоўвала палатно ўласнай вытворчасці. Сукно можна было набыць толькі праз знаёмых, бо вытворчасцю сукна займалася невялікая колькасць сельскіх жыхароў [2, с. 68-70].

Лішкі выробленай прадукцыі сяляне вывозілі на базары і кірмашы, дзе большасць тавараў куплялі пасрэднікі. Продаж у сельскіх мясцовасцях Заходняй Беларусі ажыццяўляўся за грошы, але шырока быў распаўсюджаны і менавы гандаль. Асноўнымі прадуктамі абмену сялян былі малочныя прадукты, птушка, жыта і бульба. Мянялі іх галоўным чынам на прамысловыя тавары: абутак, скуру, адзежу, мануфактуру.

Так, у в. Чудзін вельмі мала прадавалася малочных прадуктаў. Яйкі тут абменьваліся ў мясцовых магазінах на соль, фарбу для льняных сукенак, запалкі, газу і іншыя тавары. Ні масла, ні малако не прадавалі, бо самі адчувалі недахоп дадзенага віду тавараў. Кірмашы і базары, якія праводзіліся ў Клецку і Ганцавічах, на гаспадарчае жыццё в. Чудзін аказвалі малаважны ўплыў. Часцей за ўсё селянін ехаў туды з мэтай купіць трохі збожжа ці іншых тавараў і адвозіў туды трохі льнянога насення, сушаных грыбоў або некалькі штук авечых шкур [1, с. 189].

У в. Лагішын Пінскага павета мясцовае насельніцтва займалася эксплуатацыяй змешчаных тут залежаў мелу. Мел фармавалі ў шарыкі дыяметрам 10 см, якія

выкарыстоўваўся для пабелу сцен, а таксама іншых гаспадарчых мэт. Продаж яго ажыццяўлялася ўзімку. Лагішынец падрыхтоўваў воз «белым таварам», мяшкамі для бульбы і адпраўляўся ў дарогу. Паездка звычайна праходзіла па навакольных вёсках, дзе мел абменьваўся на бульбу. Кошык мелу ацэньвалася ў памеры 1:1, гэта значыць за адзін кошык мелу давалі адзін кошык бульбы. Менавы гандаль распаўсюджаны быў і сярод ганчароў [2, с. 75].

Нелегальны гандаль быў найбольш развіты менавіта ў вёсках і на перыферыі гарадоў – там, дзе кантроль улад быў слабым.

Палатачны гандаль выконваў галоўным чынам дапаможную ролю пры распаўсюджванні тавараў у населеных пунктах, дзе праводзіліся рынкі. Дыферэнцыраваны асартымент тавараў палатак, а таксама іх лёгкі перанос з месца на месца рабіла магчымым абслугоўванне кліентаў, якія масава з'язджаліся ў мясцовасці, дзе праводзіліся рынкі і базары. Неабходна адзначыць, што выезд на рынкі часта складаў адзіную вялікую падзею для сельскага насельніцтва, якое вяло на вёсцы даволі аднастайнае жыццё.

Розныя грамадска-эканамічныя ўмовы ўплывалі на тое, што вандроўны гандаль набываў зусім розныя формы ў горадзе і на вёсцы. Вандроўны гандаль у горадзе выконваў галоўным чынам раздатачную функцыю (за выключэннем скупкі даўніны), тым часам як на вёсцы галоўнай яе задачай была скупка тавараў з мэтай перапродажу. Прычым перапродаж быў найбольш распаўсюджаным. Праводзіўся ён на аснове абмену. Асноўнымі прадметамі скупкі былі рыззё, пакулле, лён, грыбы і г.д., у абмен за рознага віда галантарэю, мыла і запалкі. Гэта быў натуральны абмен. Вельмі частымі былі выпадкі, што разносчыкі выкарыстоўваючы недасведчанасць селяніна, разлічвалі яго паводле цэн на 100% вышэй ад цэн, запрошваемых у горадзе стацыянарным гандлем.

Гандляры ў базарныя дні скуплялі ў земляробаў птушку, масла, яйкі. У пякарнях набывалася печыва, якое потым разносілася па вуліцах і дамах. Гандляры марожаным з Давыд-гарадка з пачаткам сезону бралі з сабой амуніцыю, неабходную для доўгага пастоя ў іншых гарадах, і адпраўляліся ў суседнія паветы, дзе выраблялі і прадавалі свой тавар за наяўныя грошы [3, арк. 39]. Ганчары з Гарадной у асноўным мянялі свае гаршкі на зерне. Неабходна звярнуць увагу на тое, што разносна-развозны і вулічны гандаль у вялікіх гарадах быў слаба развіты. Гандаль у вялікіх гарадах ажыцяўляўся пераважна асобамі з суседніх ваяводстваў, якія гандлявалі мануфактурай, кілімамі і г.д. [3, арк. 26зв]. Жыхары Давыд-гарадка прадавалі з вазка цукровыя ледзянцы і насення агародніны ўсіх відаў. Жыхары вёскі Гарадная спецыялізаваліся на продажы гаршкоў уласнай вытворчасці. Агульная колькасць асоб, якія займаліся разносна-развозным і вулічным гандлем у Палескім ваяводстве, складала каля 650 чалавек [3, арк. 26].

Розносчыкі, якія прадавалі па вёсках, таксама збіралі замовы на тавары і дастаўлялі іх пазней, ці самі іх куплялі за гатоўку ў невялікіх колькасцях. Маглі браць у камісіённы продаж ад ананімных вытворцаў, напрыклад шакалад,

цукеркі, наборы для шыцця, мануфактуру і інш. Скуплялі для далейшага перапродажу яйкі і трусіны мех у сялян-вытворцаў.

Нягледзячы на шматлікія цяжкасці імкненне сельскага насельніцтва да заснавання ўласных магазінаў было вялікім і апраўдана дадатковымі прыбыткамі, атрыманымі з сельскай гаспадаркі.

Сельскія магазіны ў большасці сваім былі маленькімі, складаліся з аднаго памяшкання і падобныя былі на дробныя лаўкі і нават прылаўкі. Яны не мелі наёмных работнікаў, як правіла, там працаваў толькі адзін чалавек, які з'яўляўся і прадаўцом, і ўладальнікам магазіна. Абароты дадзеных прадпрыемстваў былі малымі і маглі складаць да 22 злотых штодня. Асноўную масу ўладальнікаў сельскіх магазінаў складалі яўрэі. У бедных вёсках, у якіх збожжа хапала толькі для таго, каб пракарміць сям'ю, тавараварот быў зусім нязначны.

У в. Чудзін ў 1920-х гг. XX ст. налічвалася каля 9 магазінаў і магазін гарэлкі. У часы лепшай кан'юнктуры і калі заробкі былі адносна высокімі, у магазінах можна было набыць шакалад, цукеркі, арэхі і іншыя ласункі. Тут знаходзіліся таксама магазін каўбасных вырабаў і піўная, якія мелі пастаянных кліентаў не толькі сярод прыезджых рабочых, але і мясцовай моладзі [1, с. 190].

У 1930-я гг. колькасць магазінаў скарацілася да 5. Нягледзячы на скарачэнне колькасці магазінаў, асартымент тавараў застаўся практычна ранейшым. Тут можна было набыць усё неабходнае: ад хлеба да змазкі для вазоў. Уладальнікамі магазінаў былі пераважна яўрэі. З 5 магазінаў толькі ў 2 уладальнікі былі хрысціянскага веравызнання, адзін з якіх прыязджаў з Давыд-Гарадка. Найбольшай папулярнасцю карыстаўся магазін прыезджага па мянушцы «Haradczuk» («Гарадчук»), сям'я якога мела магазіны ў шматлікіх навакольных вёсках: Малых і Вялікіх Ружанах, Гаўрыльчыцах, Чучэвічах, Калках і інш. Рэалізуемыя ім тавары прывозіліся з Барановіч, а ў дакрызісны перыяд – з Вільна [1, с. 190].

Дыяпазон цэн у Чудзіне, Ганцавічах і Клецку быў разнастайным. Ад станцыі Ганцавічы тавар дастаўляўся на вазах у невялікіх колькасцях, у залежнасці ад аддаленасці ад станцыі цана на яго расла. Так, напрыклад, 1 кг цукру ў Ганцавічах каштаваў 1 злоты 65 грошаў, а ў Чудзіне – 2 злотыя 10 грошаў. У 1930-е г. большасць тавараў першай неабходнасці набываліся сялянамі Чудзіна ў Ганцавічах. Ралецкий Р. звязвае дадзены выбар са з'яўленнем чыгуначнай келейкі з Ганцавічаў у Людвікава, за праезд па якой сяляне нічога не плацілі. Улічваючы той факт, што лесараспрацоўкі былі прыпынены, сяляне мелі досыць часу, каб набыць дадзеныя тавары па больш нізкай ў Ганцавічах. Але большасць тавараў сяляне набывалі на месцы. Найбольш распаўсюджаным таварам куплі-продажу сельскага насельніцтва была свойская жывёла, якая куплялася непасрэдна ў гаспадара. Былі і спецыялізаваныя рынкі, прызначаныя для куплі-продажу толькі жывёлы. Адбываліся яны галоўным чынам у гарадах і мястэчках [1, с. 190].

Пасля далучэння заходнебеларускіх земель, у вясковым гандлі цалкам дамінавалі яўрэйскія пляцоўкі і працэнт магазінаў, якія належалі яўрэям перавышаў у некаторых ваяводствах 90%. У адпаведнасці з дадзенымі

статыстыка-эканамічнага бюро ў 1935 году колькасць магазінаў у параўнанні з даваенным перыядам паменшылася на 35%.

Колькасць магазінаў у 1914 і 1935 гг. [4, с. 32].

| Ваяводства | Колькасць магазінаў у 1914 г. | | | Колькасць магазінаў у 1935 г. | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | Усяго | З іх, якія належалі яўрэям | У % | Усяго | З іх, якія належалі яўрэям | У % |
| Беластоцкае | 64 | 54 | 85 | 142 | 23 | 16 |
| Віленскае | 68 | 54 | 80 | 92 | 39 | 40 |
| Навагрудскае | 16 | 12 | 75 | 38 | 11 | 30 |
| Палескае | 94 | 75 | 80 | 126 | 64 | 50 |

Для заахвочвання польскіх купцоў-хрысціян да заснавання гандлёвых фірмаў на заходнебеларускіх землях пад канец 1936 г. быў выдадзены дэкрэт які прадугледжваў наданне падатковых льгот для будоўлі такіх прадпрыемстваў на тэрыторыі Навагрудскага, Віленскага, а таксама некалькіх паветаў Беластоцкага ваяводстваў у перыяд з 1 студзеня 1939 г. Дадзеныя мерапрыемствы праводзіліся з мэтай зніжэння ўдзелу яўрэйскага насельніцтва ў гандлі. Аб колькасць яўрэяў у гандлёвых адносінах у 1933 г. і 1938 г. сведчаць дадзеныя табліцы 3.9. Дадзеныя аб нацыянальным складзе заходнебеларускіх гандляроў у 1933 і 1938 гг. [4, с. 40].

| Ваяводства | Агульная колькасць гандлёвых пляцовак | | Прадпрыемствы | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | Хрысціянскія (у %) | | Яўрэйскія (у %) | | Змешаныя (у %) | |
| | 1933 г. | 1938 г. | 1933 г. | 1938 г. | 1933 г. | 1938 г. | 1933 г. | 1938 г. |
| Віленскае | 13 691 | 11 708 | 36,5 | 29,3 | 61,9 | 70,4 | 1,6 | 0,3 |
| Беластоцкае | 20 349 | | 40,1 | 27,8 | 58,2 | 71,4 | 1,7 | 0,8 |
| Навагрудскае | 10 544 | 7 884 | 34,8 | 24,0 | 63,9 | 75,6 | 1,3 | 0,4 |
| Палескае | 10 745 | 7 619 | 31,5 | 18,5 | 66,8 | 81,2 | 1,7 | 0,3 |

Асноўнай праблемай было тое, што купцы-перасяленцы прадстаўлялі іншы тып гандлю, чым той, які існаваў на тэрыторыі заходнебеларускіх земель. Акрамя таго, яны прапаноўвалі ў большасці выпадкаў тавары, якія заходнебеларускае насельніцтва магло і не ведаць, або такія, да якіх яны не былі прыстасаваны. Вельмі часта гэта былі тавары лепшай якасці, і цэны, адпаведна, на іх былі вышэй, чым на аналагічныя тавары ў яўрэяў. У выніку гэтага ў мясцовага насельніцтва склалася меркаванне пра дарагавізну ў магазінах асаднікаў, якое адпужвала пакупнікоў. Праблема высокіх цэн у хрысціянскіх магазінах і складах прыводзіла да таго, што польскія купцы аддавалі перавагу тавару з яўрэйскага аптовага склада, бо «... цукар у лавачніка, які бярэ ў яўрэя-аптавіка, значна лепш, буйней, а ў лавачніка-каталіка – горшы (пясок), наступствы для другога пакупніка жудасныя, таму што адштурхоўвае ад іх кліентуру». Акрамя таго «у не польскім аптовым складзе абслугоўванне добрасумленнае, і ў фарсіраваным рэжыме, а ў купца ўсё залежыць ад часу» [4, с. 41].

У адным з часопісаў «Kupca Wiejskiego» («Сельскі купец») адзначалася: «Як моцна яны [яўрэі] імкнуцца схіліць да сябе дзяцей, якія зазіраюць у іх магазіны. Яўрэй знойдзе для дзіцяці і слова, і ўсмешку, і некалькі цукерак і старанна спакуе тавар. Яўрэй з'яўляецца лепшым знаўцам чалавечай душы, у дадзеным выпадку дзіцячай». Гэта было найбольш удалым метадам з боку купцоў-яўрэяў, бо купцы-сяляне не надавалі ніякай увагі дадзенай «малой катэгорыі кліентаў». Гэта, у сваю чаргу, пазбаўляла іх вялікай колькасці патэнцыйных пакупнікоў, бо дарослыя, занятыя працай, пасылалі ў магазін часцей за ўсё дзяцей» [4, с. 41].

Заходнебеларускі рынак меў шэраг спецыфічных рысаў. Ён характарызаваўся невялікай запатрабаванасцю ў спажывецкіх таварах у сувязі з нізкім дабрабытам насельніцтва і захаваннем значнага сектара натуральнай гаспадаркі ў вёсцы. Шырокае распаўсюджанне ў заходнім рэгіёне польскай дзяржавы нестацыянарнага гандлю – вулічнага і вандроўнага – абумоўлівалася спецыфікай тамашняга рынку. Пашыранасць развознага гандлю выклікалася распыленнасцю паселішчаў, а ў Палессі і цяжкадаступнасцю да іх праз палескія балоты і пушчы. Вулічныя і вандроўныя гандляры мелі паважлівыя адносіны з пакупнікамі ў вёсках адпаведна са старадаўняй традыцыяй. Шырокае распаўсюджанне вулічнага і вандроўнага гандлю ўцягвала ў гандлёвую дзенасць дробных вытворцаў (рамеснікаў, сялян-саматужнікаў і сялян-землеробаў), а таксама перакупшчыкаў-яўрэяў. Яўрэі дамінавалі ва ўсіх відах гандлю.

## СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ КРЫНІЦ

1. Rolecki, R. Czudzin wieś powiatu łuninieckiego. Stosunki spoleczno-gospodarcze / R. Rolecki // Białoruskie zeszyty historyczne. – 2006. – № 26. – S. 146–217.

2. Tomaszewski, J. Z dziejow Polesia 1921–1939. Zarys stosunków społeczno-ekonomicznych / J. Tomaszewski. − Warszawa, 1963. – 209 s.

3. Дзяржаўны архіў Брэсцкай вобласці. – Фонд 1. – Воп. 1. – Спр. 333. Цыркуляр Міністэрства прамысловасці і гандлю Палескага ўпраўлення; перапіска з павятовымі староствамі аб стане дробнага гандлю ў паветах (1936 г.).

4. Korycki, G. Etyka kupiecka i handel przywatny w Drugiej Rzeczypospolitej / G. Korycki. – Warszawa, 1993. – 131 s.